Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Чакаецца даволі складаны тыдзень, так што варта рэальна разлічваць сілы і магчымасці. Мудрасць і цярпенне спатрэбяцца для таго, каб утрымаць пераменлівую ўдачу. Аўторак акажацца досыць канструктыўным днём, калі зможаце падзяліцца сваімі ідэямі і задумамі. Да вас прыслухаюцца і дапамогуць увасобіць іх у жыццё. У пятніцу можа парадаваць новая цікавая інфармацыя, якая дазволіць пашырыць вашыя магчымасці. У выхадныя ўстройце сабе невялікае свята.

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні асабліва важна праявіць разважлівасць і цярпенне. Хуткі поспех можа так жа хутка расчараваць, а то і зусім абярнуцца паражэннем. Бесшабашных учынкаў быць не павінна, іх наступствы могуць не толькі ўскладніць жыццё, але і крута змяніць лёс. У чацвер адмоўцеся ад чужых і неабавязковых спраў. У выхадныя дні могуць збянтэжыць нечаканыя падзеі ў жыцці сяброў або калег па працы.

БЛІЗНЯТЫ. Спрыяльны тыдзень для людзей творчых прафесій. Добры час для рэалізацыі самых смелых і крэатыўных планаў. Будзьце ўважлівыя да інфармацыі, якая паступае, магчымыя недакладнасці і скажэнні. У сераду прадбачацца цікавыя і выгадныя дзелавыя прапановы. У чацвер паспяхова справіцеся з назапашанымі справамі і праблемамі. Нядзелю лепш правесці за горадам.

РАК. Зможаце досыць лёгка разабрацца з усімі справамі. У панядзелак магчыма неразуменне з блізкім чалавекам. Прымірэнне запатрабуе ад вас нестандартных рашэнняў і пазбаўлення ад шкодных звычак. У другой палове тыдня давядзецца браць на сябе адказнасць за прыняцце рашэнняў, якія паўплываюць на найбліжэйшую будучыню. У суботу вашы ідэі адкрыюць просты шлях да поспеху. Будзеце задаволены сітуацыяй, якая склалася.

ЛЕЎ. На гэтым тыдні пажадана з асцярожнасцю паставіцца да новых знаёмстваў, яшчэ невядома, у якія нетры яны вас завядуць. Плануйце, адважвайцеся, не адступайцеся ад вызначанай мэты, але рэальна сувымярайце свае энергетычныя рэсурсы і ўзятыя на сябе абавязацельствы. У чацвер збярыцеся і пакажыце ўсе свае таленты ў новай аўдыторыі. Таварыскасць зробіць вас душой любой кампаніі.

ДЗЕВА. Спрыяльны перыяд для ўнутранай працы і самаўдасканалення. У аўторак грамадская дзейнасць можа прынесці задавальненне, паспрабуйце ў гэты дзень рэалізаваць даўно намечаныя планы. У чацвер можаце адчуць прыліў бадзёрасці, што станоўча адаб'ецца на працаздольнасці. У канцы тыдня ўмерце свой запал і амбіцыі, а вольны час паспрабуйце правесці ў адзіноце. У суботу не спяшайцеся прымаць сур'ёзныя рашэнні, якія датычацца асабістага жыцця.

ШАЛІ. На гэтым тыдні ўдзяліце пільную ўвагу працы. Нядбайнасць і памылкі начальства не даруе. Варта праяўляць абачлівасць і асцярожнасць як у словах, так і ў дзеяннях. У сераду пэўныя акалічнасці могуць прымусіць узяцца за нязвыклую працу. Не хвалюйцеся, вы ўсё зробіце на высокім узроўні. У пятніцу будзьце асцярожныя, бо любая сказаная фраза можа павярнуцца супраць вас. Акрамя таго, апошні працоўны дзень на гэтым тыдні не падыходзіць для абмеркавання ўчынкаў таварышаў па службе.

СКАРПІЁН. У панядзелак варта засцерагчы сябе ад залішняй працы, расходуйце сваю энергію і сілы рацыянальна. У сераду знайдзіце час, каб вывучыць сітуацыю, якая склалася, ва ўсіх яе аспектах. У пятніцу варта ўжыць усю сваю прывабнасць для дасягнення кар'ерных вышынь. Не выключаны адкрыцці і пазітыўныя перамены, перш за ўсё гэта датычыцца тых, хто працуе ў сферы навукі і творчасці. У нядзелю спатрэбяцца камфорт і спакой.

СТРАЛЕЦ. Вашы ідэі і планы, нягледзячы на крыху авангардны характар, знойдуць разуменне і падтрымку. Не будзьце залішне сціплымі, дазвольце раскрыцца сваім талентам і здольнасцям. На працы спатрэбіцца максімальная сабранасць, больш упэўненасці ў сваіх сілах. Вам проста неабходна мабілізавацца і працаваць нават больш, чым звычайна. Аднак паспрабуйце не зацыклівацца на адной праблеме, інакш ад гэтага акажуцца закінутымі іншыя сферы жыцця.

КАЗЯРОГ. Прычынай няўдач на гэтым тыдні можа стаць залішняя даверлівасць да інфармацыі, атрыманай у аўторак. Акрамя таго, вы занадта доўга паводзілі сябе добра, па правілах, так што зараз час даць выхад унутранаму напружанню. Але зрабіць гэта трэба так, каб ніхто з навакольных не пацярпеў. Зусім адпускаць тармазы і губляць кантроль усё ж не варта. Не перашкодзіць павышаная ўвага да спраў дзяцей у выхадныя дні.

ВАДАЛІЎ. Ад вашай адказнасці і сур'ёзнага падыходу залежыць дзелавы поспех. Адносіны з партнёрамі будуць неадназначныя. У пятніцу атмасфера душэўнага камфорту спрыяе таму, каб трохі заленавацца, якраз у гэты момант вас можа наведаць цікавая ідэя. Падзяліцца навінамі пра апошнія падзеі ў жыцці вам удасца ў суботу ў коле сяброў.

РЫБЫ. Будзеце ў добрым настроі, дзякуючы чаму ўсё намечанае атрымаецца практычна з першага разу. Калі прыкладзяце пэўныя намаганні, то перашкод у дасягненні мэт не ўзнікне. Гэта датычыцца і прафесійнай, і асабістай сферы. У другой палове тыдня з'явіцца магчымасць рэалізаваць свае жаданні і зрабіць адказныя крокі. Ваша здольнасць знаходзіць дакладныя рашэнні і своечасовая падтрымка блізкіх людзей дапамогуць стварыць выдатныя перадумовы для будучага поспеху.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.40	19.29	12.49
Віцебск —	6.29	19.19	12.50
Магілёў —	6.30	19.19	12.49
Гомель —	6.28	19.14	12.46
Гродна —	6.56	19.44	12.48
Брэст —	6.58	19.43	12.45

Месяц

Маладзік 9 верасня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Марфы, Сямёна.*
К. *УЗВІЖАННЕ. Альберта, Бярнарда, Рамана.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

П'яны мужык тэлефануе ў дзверы сваёй кватэры, яму адкрывае жонка. Ён заходзіць, акуратна зачыняе за сабой дзверы, паварочваецца спінай да жонкі і кажа:

— Мне на пяты.

Разумная, выхаваная, інтэлігентная, добрая! Але, блін, як за руль саджуся, як быццам два тэрміны «адматала»...

Я даўно доследным шляхам устанавіў: калі табе не падабаецца якая-небудзь рэч у сяброўкі, то дастаткова мімаходзь сказаць: «О, у маёй былой была такая ж», каб яна ад яе пазбавілася.

Жонка ўстала з раніцы на вагі і задуменна так сказала:

— Нешта я даўно не стрыглася.

Даты Падзеі Людзі

14 ВЕРАСНЯ

1920 год — у Мінску спектаклем «Рысь» паводле аповесці «У зімовы вечар» Э. Ажэшкі адкрыўся Беларускі дзяржаўны тэатр (з 1926 года — БДТ-1). У 1944 годзе тэатру прысвоена імя Янкі Купалы, з 1955-га носіць званне акадэмічнага, з 1993-га — Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы. Першапачаткова ў склад тэатра ўваходзілі беларуская, руская і яўрэйская трупы, а таксама хор, балетная трупа і сімфанічны аркестр. Асновай маладога тэатра сталі акцёры Першага беларускага таварыства драмы і камедыі пад кіраўніцтвам Ф. Ждановіча, які і ўзначаліў новы калектыў. Сярод першых пастановак пераважалі спектаклі, якія грунтаваліся на творах беларускіх аўтараў, з ярка выяўленай нацыянальнай тэматыкай.

1938 год — нарадзіўся (г. Разань, Расія) Аляксандр Фёдаравіч Чарняўскі, беларускі вучоны ў галіне інфарматыкі, член-карэспандэнт, акадэмік НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі. Аўтар больш як 290 навуковых прац. Лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР, Дзяржаўнай прэміі Беларусі, Дзяржаўнай прэміі СССР.

1867 год — выйшаў першы том «Капіталу», галоўнай працы Карла Маркса па палітычнай эканоміі, якая змяшчае крытычны аналіз капіталізму. Праца напісана з ужываннем дыялектыка-матэрыялістычнага падыходу, у тым ліку да гістарычных працэсаў.

1943 год — з караблёў Волжскай флатыліі была сфарміравана Дняпроўская ваенная флатылія. З 1944 года яе галоўнай базай быў Пінск. Флатылія ўваходзіла ў склад Варонежскага, 1-га Украінскага, 2-га і 1-га Беларускіх франтоў. Мела каля 200 караблёў, ударную сілу складалі бранекатары. Уключала ў сябе тры брыгады рачных караблёў, з якіх 1-я і 2-я ўдзельнічалі ў вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у складзе 1-га Беларускага фронту — у Бабруйскай аперацыі, у баях за Петрыкаў, Лунінец, Тураў, Пінск. З восені 1944-га па май 1945-га — удзельнічала ў наступальных баях на рэках і каналах Польшчы і Германіі, у тым ліку ў вызваленні Варшавы і штурме Берліна. Расфарміраваная ў красавіку 1951 года.

1944 год — пачалася Прыбалтыйская стратэгічная наступальная аперацыя войскаў Ленінградскага, 3-га, 2-га, 1-га Прыбалтыйскіх і 3-га Беларускага франтоў ва ўзаемадзеянні з сіламі Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту. Завяршылася 24 лістапада.

1960 год — на канферэнцыі ў Багдадзе з мэтай каардынацыі палітыкі ў галіне нафты створана Арганізацыя краін — экспарцёраў нафты (АПЕК).

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zviazda.by, (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79, РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3442. Нумар падпісаны ў 19.30 13 верасня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12